# МАНУМЕНТАЛЬНЫ ТАЛЕНТ. ВЯДОМЫ БЕЛАРУСКІ МАСТАК І СКУЛЬПТАР УЛАДЗІМІР ЦЕРАБУН СВЯТКУЕ 75-ГАДОВЫ ЮБІЛЕЙ

*Крыніца публікацыі:*
Сідаркевіч, Д. Манументальны талент. Вядомы беларускі мастак і скульптар Уладзімір Церабун святкуе 75-гадовы юбілей [Электронны рэсурс] / Дзіяна Сідаркевіч ; фота // grodnonews.by. – Рэжым доступу : https://grodnonews.by/news/kultura/manumentalny_talent_vyadomy_belaruski_mastak_i_skulptar_uladzimir_tserabun_svyatkue_75_gadovy_yubiley.html. – Дата доступу : 21.04.2021. – на бел. мове.

Мемарыялы і скульптурныя кампазіцыі Уладзіміра Церабуна ўпрыгожваюць многія гарады Беларусі



Сёння творчы шлях члена Беларускага саюза мастакоў, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі і ганаровага грамадзяніна горада Смаргоні налічвае дзесяткі работ станковага і манументальнага характару: ад скульптуры з мазаікай да кампазіцыі са шкла і метала... Акрамя таго, на яго рахунку каля дваццаці выстаў. Першая персанальная, дарэчы, прайшла ў Гродне ў 1986 годзе.

Мемарыялы і скульптурныя кампазіцыі Уладзіміра Церабуна ўпрыгожваюць многія гарады Беларусі: «Заўсёды на варце» і «Ветразь» – у Гродне, «Дрэва жыцця» – у Вялікай Бераставіцы, «Клёкат буслоў» – у Скідзелі, «Пайшлі ў бессмяротнасць» – у Слоніме.




СУПРАЦОЎНІКАМ МІЛІЦЫІ, ЯКІЯ ЗАГІНУЛІ ПРЫ
ВЫКАНАННІ СЛУЖБОВАГА І ВОІНСКАГА АБАВЯЗКАЎ





З дапамогай манументальнага мастацтва Церабун аднаўляе памяць аб трагічных старонках гісторыі Беларусі. Тэма народнага подзвігу – асабліва блізкая аўтару. Неаднаразова ў сваіх працах ён закранае тэму Вялікай Айчыннай вайны. Тут цікавай з'яўляецца серыя малюнкаў пад назвай «Ракурс». Скульптар упэўнены, што памяць пра мінулае – гэта заклад шчаслівай будучыні.



*– Спектр творчых дасягненняў і грамадскіх ініцыятыў Уладзіміра Васільевіча сапраўды шырокі. Нездарма ў школе №1 горада Смаргоні, дзе ён вучыўся, кіраўніцтва, пачаўшы рэканструкцыю музейнай залы «Наш гонар» у гісторыка-краязнаўчым музеі, на бачным месцы размясціла багатую экспазіцыю, прысвечаную ганароваму вучню, а таксама ганароваму грамадзяніну горада Смаргоні,* – адзначыў Расціслаў Шчасны, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства СШ №1 г. Смаргоні, кандыдат педагагічных навук, заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь. – *Творы нашага таленавітага земляка ўпрыгожваюць Смаргоншчыну: тут ёсць памятныя знакі «500 год гораду Смаргоні» і «Рэха вайны», воінам- інтэрнацыяналістам Смаргоншчыны, якія загінулі пры выкананні воінскага абавязку ў Афганістане, скульптурная кампазіцыя «Мядзведжая акадэмія». Горад удзячны і за каменныя малыя скульптурныя формы – вынік пленэру, у арганізацыі якога прымаў удзел мастак.*

Да юбілею Уладзімір Васільевіч выдаў альбом «На хвалях часу», які яшчэ глыбей адкрывае сутнасць грамадзянскай пазіцыі мастака: адданасць любімай справе, любоў да Беларусі, высокая ідэйнасць, дзейсны патрыятызм, актыўная грамадзянская і жыццёвая пазіцыя…